*УДК 373.5.016.*

# АНАЛІЗ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ФАКТАР АВАЛОДАННЯ МЕТАДЫЧНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ

**І. М. Саматыя**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, irinas2015@tut.by*

У артыкуле разглядаецца праблема развіцця метадычнага аналізу ўрока беларускай мовы ў сувязі са змяненнямі патрабаванняў да сучаснага ўрока. Пратакольны запіс і аналіз урока падаюцца як важны аспект фарміравання метадычнага майстэрства студэнтаў-практыкантаў, настаўнікаў-практыкаў.

***Ключавыя словы:*** урок; актуальныя патрабаванні да ўрока; метадычнае майстэрства; дапаможнікі па методыцы выкладання мовы; віды аналізу; схема назірання; пратакольны запіс урока; праграма практыкі.

# ANALYSIS OF THE BELARUSIAN LANGUAGE LESSON AS A FACTOR OF MASTERING METHODOLOGICAL SKILLS

**I. M. Samatyia**

*Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, irinas2015@tut.by*

The article examines the problem of developing methodological analysis of the Belarusian language lesson in connection with changes in the requirements of the modern lesson. Lesson protocol and analysis are presented as an important aspect of methodological skills formation for student interns and teacher interns.

***Key words:*** a lesson; actual requirements for the lesson; methodological skills; manuals of language teaching methodology; types of analysis; the scheme of observing; lesson protocol; practice programme.

Урок ва ўсёй яго разнастайнасці і ва ўсіх разнавіднасцях – складаная педагагічная з’ява. Якім павінен быць сучасны ўрок? Як спалучыць майстэрства настаўніка і запатрабаванні часу, традыцыйнае і новае?

Метадычнае майстэрства – абагульненая здольнасць настаўніка аптымальна ажыццяўляць матывацыйную дзейнасць пры канкрэтнай мэце і канкрэтных умовах, якая праяўляецца ў выніку інтэграцыі элементаў метадычнай культуры і якасцей індывідуальнасці, і функцыянуе як комплекснае ўменне.

Адзін з важных аспектаў арганізацыі і правядзення ўрока – гэта яго метадычны аналіз, які арыентуецца на ацэнку структуры і зместу ўрока, тэхналогію яго правядзення, эфектыўнасці вырашэння вучэбна-метадычных задач.

З узорам аналізу ўрока беларускай мовы мы сустракаемся ўжо ў другім выданні першай «Методыкі роднай мовы, 1930 (у суаўтарстве)» Канстанціна Міцкевіча [1]. Раздзел мае назву «План рэцэнзіі пры разборы практычных работ у школе» з падзагалоўкам «Па Кульману» [П. Кульман – аўтар Методыкі рускай мовы мовы для педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў і семінарый, для педагагічных класаў і настаўнікаў сярэдніх і нізшых школ (1918 г.). – І. Саматыя]. Аўтары адзначаюць, што «пры разборы пробных работ трэба мець на ўвазе:

1.Змест паняццяў або матэрыял выкладання.

2.Прыёмы выкладання або метадычны бок.

3.Знадворныя якасці работы». [1, с. 610–611].

Далей кожны з пералічаных пунктаў падрабязна характарызуецца. Першы пункт патрабуе кіравацца прынцыпамі навуковасці ў падачы матэрыялу і, кажучы сучаснай мовай, прыцыпам уліку ўзроставых асаблівасцей вучняў.

Пры характарыстыцы метадычнага боку практыкантам прапануецца адказаць на шэраг пытанняў, звязаных з патрабаваннямі: «паступовасці ў вядзенні лекцыі»; «з работай  на аснове самадзейнасці вучняў»; пастаноўкі пытанняў; «як папраўляліся няверныя адказы»; «якія затрудненні ўзніклі пры рабоце»; «ці выявіў практыкант у такіх выпадках знаходлівасць» і інш. [1, с. 610].

Пра знадворны бок: аўтары прапануюць аналізаваць «голас практыканта, тэмп мовы; палажэнне практыканта ў класе (нерухомае стаянне, нервовае паходжанне па класе, свабоднае трыманне), гутарка з паасобнымі вучнямі; дысцыпліна, адносіны да паводзін вучняў; ці не выявіліся нястрыманасць, злосць, нячуласць да дзяцей». Як бачым усё пералічанае разглядаеццаі і сёння пры традыцыйным аналізе ўрока беларускай мовы.

У аснову аналізу ўрока кладзецца комплексны падыход, у якім цесна ўзаемазвязаны педагагічны, змястоўны, метадычны, прадметныя аспекты.

У сучасных методыках выкладання беларускай мовы выдзяляюцца ў залежнасці ад мэты наступныя віды аналізу: структурны (паэтапны), аспектны (паэлементны), сістэмны, комплексны (поўны), экспрэс-аналіз [2, с. 125–126].

Структурны аналіз урока выкарыстоўваецца з мэтай характарыстыкі і ацэнкі яго ўнутранай арганізацыі ў адпаведнасці са структурай (па асобных этапах).

Калі ўзнікае неабходнасць у карэкціроўцы працы настаўніка ці вывучэнні яго вопыту, праводзіцца аспектны аналіз, звязаны з асэнсаваннем

асобных элементаў прафесійнай дзейнасці: спосабы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, формы кантролю і ацэнкі і інш.

Экспрэс-аналіз – кароткі аналіз урока з агульнай яго характарыстыкай.

Пры комплексным аналізе ўрока навучальны працэс разглядаецца як адзінае цэлае ва ўзаемасувязі мэты, зместу, форм і метадаў навучання.

Сістэмны аналіз прадугледжвае аналіз не аднаго, а сістэмы ўрокаў – сістэмы працы настаўніка. Апошні від аналізу і ацэнкі педагагічнай дзейнасці лічыцца найболыш аптымальным і аб'ектыўным.

На сённяшні дзень да ўрока мовы ўдакладняюцца і прад'яўляюцца актуальныя патрабаванні:

- ✓ тэма ўрока фармулюецца навучэнцамі. Задача настаўніка дапамагчы ім асэнсаваць тэму;
- ✓ вучні самастойна ажыццяўляюць пастаноўку мэт і задач. Настаўнік толькі задае патрэбныя пытанні і прапануе заданні, якія дапамагаюць вучням дакладна сфармуляваць практычныя мэты;
- ✓ вучні выконваюць навучальныя дзеянні па распрацаваным плане. Настаўнік арганізуе індывідуальную працу, у парах, у групах, кансультуе вучняў;
- ✓ правільнасць выканання заданняў правяраецца з дапамогай самакантролю, узаемакантролю;
- ✓ этап рэфлексіі: абмеркаванне навучэнцамі сваіх поспехаў у дасягненні мэты ўрока;
- ✓ хатняе заданне прапануецца з улікам індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў. Яно прадугледжвае магчымасць выбару практыкаванняў, розныя ўзроўні складанасці;
- ✓ такім чынам прадугледжваецца высокая ступень маўленчай актыўнасці;
- ✓ на працягу ўсяго ўрока настаўнік выконвае ролю кансультанта навучэнцаў на кожным этапе.

У сувязі з такімі патрабаваннямі мяняецца і аналіз урока.

Асноўныя пункты, на якія пажадана звяртаць увагу, аналізуючы сучасны ўрок: мэты, арганізацыя ўрока, спосабы матывацыі навучэнцаў, адпаведнасць патрабаванням да сучаснага ўрока, змест урока, методыка, псіхалагічныя моманты.

У пратакольным запісе наведанага ўрока ўказваецца імя, імя па бацьку, прозвішча настаўніка, поўная назва адукацыйнай установы, клас, назва вучэбнага прадмета, аўтары ВМК / дапаможніка, тэма ўрока, дата наведвання.

Сучасныя метадысты прапануюць прыкладныя ўдасканаленыя схемы аналізу ўрока [3]:

*Табліца 1*

**Аналіз урока**

| № | Этапы аналізу ўрока | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Асноўныя мэты ўрока: адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая. Ці прасочваецца рэалізацыя пастаўленых настаўнікам мэт урока? | |
| 2. | Арганізацыя ўрока: тып урока, структура ўрока, этапы, іх лагічная паслядоўнасць і дазіраванне ў часе, адпаведнасць пабудовы ўрока яго зместу і пастаўленай мэце. | |
| 3. | Якім чынам настаўнік забяспечвае матывацыю вывучэння дадзенай тэмы (навучальны матэрыял). | |
| 4. | Адпаведнасць урока сучасным патрабаванням:<br>– развіццё УНД (універсальных навучальных дзеянняў);<br>– выкарыстанне сучасных тэхналогій: ІКТ, даследчай, праектнай і інш. | |
| 5. | Змест урока:<br>– правільнасць асвятлення навучальнага матэрыялу з навуковага пункту гледжання, адпаведнасць узросту навучэнцаў;<br>– адпаведнасць урока, яго зместу патрабаванням адукацыйнай праграмы;<br>– развіццё самастойнасці і пазнавальнай актыўнасці з дапамогай стварэння сітуацый для прымянення ўласнага жыццёвага вопыту школьнікаў (узаемасувязь тэорыі і практыкі).<br>– сувязь новага і раней вывучанага матэрыялу, наяўнасць міжпрадметных сувязей. | |
| 6. | Методыка правядзення ўрока:<br>– актуалізацыя наяўных ведаў, спосабаў вучэбнай дзейнасці. Фарміраванне праблемнай сітуацыі, наяўнасць праблемных пытанняў;<br>– якія метады прымяняў педагог? Якія суадносіны рэпрадуктыўнай і даследчай/ пошукавай дзейнасці? Параўнайце прыкладную колькасць рэпрадуктыўных (чытанне, паўтарэнне, пераказ, адказы на пытанні па зместу тэксту) і даследчых заданняў (даказаць сцвярджэнне, знайсці прычыны, прывесці аргументы, параўнаць інфармацыю, знайсці памылкі і інш.);<br>– ці пераважае дзейнасць вучняў у параўнанні з дзейнасцю педагога? Наколькі аб'ёмная самастойная работа навучэнцаў? Які яе характар?<br>– якія метады атрымання новых ведаў прымяняе педагог (аналіз, параўнанні, назіранні, чытанне, пошук інфармацыі і інш. | |
| 7. | Псіхалагічныя моманты ў арганізацыі ўрока:<br>– ці прымае настаўнік да ўвагі ўзровень ведаў кожнага асобнага вучня і яго здольнасці да навучання?<br>– Ці накіравана вучэбная дзейнасць на развіццё памяці, маўлення, мыслення, успрымання, уяўленняў, увагі?<br>– Ці ёсць чаргаванне заданняў рознай ступені складанасці? Наколькі разнастайныя віды вучэбнай дзейнасці?<br>– Ці ёсць паўзы для эмацыйнай разгрузкі навучэнцаў?<br>– Наколькі аптымальны аб'ём хатняга задання? Ці дыферэнцыравана яно па ўзроўні складанасці? Ці ёсць у вучняў права выбару дамашняга задання? Ці зразумелы інструктаж па яго выкананні? | |

У графе «Колькасць балаў» насупраць кожнага падпункта робяцца пазнакі або выстаўляюцца балы ад 0 да 2, дзе 0 – поўная адсутнасць крытэрыю, 1 – частковая прысутнасць крытэрыю, 2 – крытэрый прадстаўлены ў поўным выглядзе.

*Заўвага.* У графе «Як арганізаваны ўрок?» неабходна ўлічваць разнастайнасць тыпаў урокаў: урок засваення новых ведаў, комплекснага прымянення ведаў і ўменняў (замацаванне), актуалізацыі ведаў і ўменняў (паўтарэнне), сістэматызацыі і абагульнення ведаў і ўменняў, кантролю, карэкцыі, камбінаванага ўрока, паколькі кожны з якіх мае сваю структуру.

Для таго каб прааналізаваць графу «Псіхалагічныя моманты ў арганізацыі ўрока», наведвальнік (практыкант) павінен мець аб'ектыўную аснову для выказвання сваіх аналітычных меркаванняў. Агульнавядома, што любы псіхолага-педагагічны інструментарый, любая методыка ці тэхналогія падбіраюцца пад магчымасці навучэнца. Таму, як лічаць педагогі М. Паташнік і М. Левіт [4], пажадана, каб настаўнік, які праводзіць урок, спачатку даў характарыстыку класу, распавёў аб праекце ўрока, растлумачыў наведвальнікам (практыкантам), дзе і як ён улічваў тыя ці іншыя асаблівасці плана ўрока. Абавязкова неабходна тлумачэнне для наведвальнікаў, дзе і як улічваліся тыя ці іншыя асаблівасці груп навучэнцаў пры канструяванні праекта (адрозненні навучэнцаў па дамінанце функцыянальнай асіметрыі паўшар'яў галаўнога мозга: колькі лева-, колькі правапаўшарных дзяцей і колькі дзяцей са змешаным тыпам успрымання; як адрозніваюцца дзеці па каналах успрымання: колькасць аўдыялаў, візуалаў, кінестэтыкаў; адрозненні дзяцей па тэмпераменце; у якой меры навучэнцы валодаюць метапрадметнымі ўменнямі: абагульнення, выдзялення галоўнага, істотнага абстрагавання, класіфікацы і інш. Думаецца, што ў Праграме па педагагічнай практыцы ад кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі пажадана прадугледзець заданне выконваць характарыстыку не толькі аднаго вучня, а і ўсяго класнага калектыву. Прычым гэтую працу патрэбна пачынаць з самага пачатку практыкі, каб настаўнікі-практыканты пры складанні планаў і правядзенні ўрокаў абапіраліся на такую інфармацыю пры выбары метаў і прыёмаў навучання.

Форма паведамлення пра ўрок, на якім будуць прысутнічаць практыканты, а таксама яго структура, як правіла, вызначаюцца самім настаўнікам. Традыцыйна гэта наступная інфармацыя: месца ўрока ў тэме і раздзеле курса, мэты (сёння – з улікам кампетэнтнаснага падыходу), характарыстыка зместу вучэбнага матэрыялу, метады і формы яго падачы з тлумачэннем іх выбару, інфармацыя пра структуру ўрока, расход часу на на розных яго этапах, абгрунтаванне выбраных сродкаў навучання. Пажадана назваць вядучыя дыдактычныя тэорыі, канцэпцыі, адукацыйныя

практыкі, на якіх грунтуецца план урока, называць працы вучоных-метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў, ідэі і вопыт якіх быў запазычаны.

У графе «Наколькі ўрок адпавядае сучасным патрабаванням?» неабходна ацаніць вынікі, прадстаўленыя ў выглядзе ўніверсальных навучальных дзеянняў. Наведвальніку ўрока (практыканту) неабходна ацаніць вынікі, прадстаўленыя ў выглядзе ўніверсальных навучальных дзеянняў:

– рэгулятыўныя: навучэнцы самастойна вызначаюць мэту ўрока, складаюць план, дзейнічаюць па плане, ацэньваюць вынік сваёй працы;

– пазнавальныя: навучэнцы здабываюць інфармацыю з прапанаваных крыніц, яе аналізуюць / класіфікуюць / параўноўваюць і інш.;

– камунікатыўныя: навучэнцы выразна фармулююць сваю пазіцыю, здольныя да разумення іншых, счытвання яўнай інфармацыі ці падтэксту, да супрацоўніцтва;

– асобасныя: навучэнцы арыентуюцца ў сістэме каштоўнасцей, выбіраюць правільныя напрамкі дзейнасці, здольныя ацэньваць учынкі, знаходзіць матывы дзеянням.

Прадстаўлены прыклад схемы аналізу ўрока можа служыць рабочай картай практыканта.

У 2022–2023 навучальным годзе студэнты 2 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія (па напрамках)» праходзілі азнаямляльна-адаптацыйную практыку. Да гэтага быў асвоены толькі курс «Методыкі выкладання мовы», а «Методыка выкладання літаратуры» толькі пачалася. Студэнтам-практыкантам патрэбна навучыцца рабіць пратакольны запіс урока і яго аналіз. З гэтай мэтай у дапаможніках па методыцы, праграмах па практыках прапануюцца розныя схемы запісу і аналізу ўрокаў [5].

Аднак не маючы пакуль што вялікага багажу ведаў і вопыту, другакурснікі чакаюць ад урока эфектаў. Не адрозніваюць эфектыўны ўрок ад эфектнага. Для дапамогі практыкантам можна прапанаваць апорную карту назірання ўрока, распрацаваную М. І. Запрудскім і Г. А Сухавай [6, с. 75]:

*Табліца 2*

**Карта назірання ўрока**

| № | Аб'екты назірання | Так | Не | Якія факты пра гэта сведчаць |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Ці былі ў пачатку ўрока актуалізаваны апорныя веды | | | |
| | | | | |

У карту назіранняў могуць быць уключаны наступныя крытэрыі:

✓ Ці была ў навучэнцаў мэта іх дзейнасці на ўроку?

✓ Ці атрымлівалі навучэнцы веды ў гатовым выглядзе?

✓ Ці былі ўключаны вучні ў самастойнае атрыманне ведаў?

✓ Ці ўмела былі прыменены індывідуальныя, парныя і групавыя формы пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў?

✓ Як адбывалася арганізацыя зваротнай сувязі ў класе?

✓ Ці рацыянальна быў размеркаваны час ўрока?

✓ Ці ўсе вучні дасягнулі сваёй мэты?

✓ Ці была арганізавана адпаведная карэкцыя працы?

✓ Ці можна сказаць, што ўрок быў эфектным?

✓ Ці ёсць доказ таго, што ўрок быў эфектыўным?

Такім чынам у кожнага назіральніка будзе запоўненая карта – неабходная ўмова для канструктыўнай размовы ўдзельнікаў па ўроку, паколькі іх пратаколы не будуць ідэнтычнымі.

У Праграму па адаптацыйнай практыцы [5] уключаны дадатковы варыянт запісу ўрока, распрацаваны М. І. Запрудскім і Г. А. Сухавай [6]:

*Табліца 3*

**Варыянт запісу ўрока**

| **Этапы ўрока** | **Дзейнасць** | | **Адступленне ад нормаў** | **Пазітыўныя моманты ўрока** |
|---|---|---|---|---|
| | ***настаўніка*** | ***вучняў*** | | |
| | | | | |

Назіранне ажыццяўляецца ў большай меры за тым, як працуюць навучэнцы, а не за дзейнасцю настаўніка (для гэтага пажадана напрактыкантам-назіральнікам размяшчацца перад класам, а не за апошняй партай, адкуль можна бачыць толькі патыліцы вучняў, ды і то не ўсіх).

Заўвага! У графе «Адступленне ад нормаў» звяртаецца ўвага на захаванне настаўнікам правіл, устаноўленых Міністэствамі адукацыі і аховы здароўя, дакументамі ўстановы адукацыі: вучэбнага плана; нормаў дзесяцібальнай шкалы ацэнкі вучэбных дасягненняў навучэнцаў; інструкцыі аб парадку фарміравання вуснага і пісьмовага маўлення вучняў; санітарна-гігіенічных правіл; дыдактычных прынцыпаў; правіл той тэхналогіі, якая прымяняецца ўроку і інш. Напрыклад: выстаўляецца вучню адзнака «8», але яна не адпавядае нормам; настаўнік не звяртае ўвагу на двух вучняў, якія не працуюць; у вучняў не было мэты іх дзейнасці на ўроку, а назіральнік разумее, што гэта неабходная ўмова для забеспячэння іх матывацыі і інш.

Метадысты М. І. Запрудскі і Г. А. Сухава прапануюць карысныя парады па абмеркаванні ўрока. Студэнты, якія прысутнічаюць на ўроку, падкрэсліваюць (безацэначна) тыя моманты ўрока, у якіх праявіліся

супярэчнасці паміж рэальнасцю і нормамі (напрыклад, пасіўнасцю любога з вучняў, адсутнасць нагляднасці, адхіленне ад нормаў пры выстаўленні адзнак, непрадуктыўнае выкарыстанне часу ўрока і інш.); калі студэнт сумняваецца, ён перапытвае настаўніка ці правільна ён пераказвае ўрок. Настаўнік мае права перапыніць студэнта-выступоўцу, калі бачыць скажэнне сітуацыі.

Настаўніку чуць заўвагі непрыемна. Заўвагі – кароткі шлях да непаразуменняў і канфліктаў. Замест заўваг настаўніка просяць адказаць на пытанні, якія адпавядаюць разыходжанням паміж рэальнасцю і нормамі.

Прыклады фармулёўкі пытанняў: «Калі ласка, абгрунтуйце сваё рашэнне, што….»; «З чаго Вы зыходзілі, калі…..?»; «Чым Вы растлумачыце……?»

Прыклад выкарыстання такіх пытанняў са школьнай практыкі:

Назіральнік-практыкант пасля адкрытага ўрока зазначае, што настаўніца па большай частцы звярталася да паспяховых вучняў. Да адстаючых яна праяўляла ўвагу толькі зрэдку. Задаецца пытанне: «Растлумачце, калі ласка, чаму на ўроку Вы працавалі толькі з паспяваючымі вучнямі?» Такія пытанні маюць на мэце тлумачэнне настаўніка, якое прасвятліць сітуацыю.

На гэтым праца з крытыкай не заканчваецца. Наступны этап – стварэнне сітуацыі для змены выніку. Вось, як гэта можа выглядаць на практыцы: «Мы вызначылі, што на Вашым уроку…. (называецца адхіленне ад нормы). Як, на Вашу думку, можна змяніць гэтую сітуацыю? Што можна зрабіць?», «Вы самі выявілі, што…. (называецца, што менавіта). Як Вы збіраецеся змяніць гэта?»

Крытыка як дыялог – гэта гуманны метад у адносінах да сябе і людзей. Яго варта паспрабаваць хаця б для таго, каб адчуць розніцу ў зносінах і адносінах з іншымі.

Кніга «Эффективные практики методической работы в школе» М. І. Запрудскага і Г. А. Сухавай [6] змяшчае шмат матэрыялаў, якія стануцца прыдатнымі для арганізацыі азнаямляльна-адаптацыйнай і педагагічнай практык студэнтаў. Пералічым, да прыкладу, некаторыя раздзелы дапаможніка: «Даследаванне ўрока», «Настаўніцтва», «Майстар-клас», «Урок для дарослых (у параўнанні з урокам ля навучэнцаў)», «Коўчынг», «Сітуацыйны аналіз (аналіз канкрэтных сітуацый, case study)» і інш.

Такім чынам, паколькі час патрабуе новых падыходаў, навукоўцы-метадысты, настаўнікі-практыкі імкнуцца разнастаіць віды працы па колькасці варыянтаў пратакольнага запісу ўрока і яго аналізе. Іх разнастайнасць павінна дапамагаць студэнтам, настаўнікам авалодваць педагагічным майстэрствам выкладання беларускай мовы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. План рэцэнзіі пры разборы практычных работ у школе // Колас Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 15. П’есы. Метадычныя распрацоўкі / Якуб Колас; рэд. тома Т. С. Голуб; падрыхт. тэкстаў і камент. А. І. Шамякінай; Нац. Акад. навук Беларусі , Ін-т мовы і літ. Імя Я. Коласа і Я. Купалы. Мінск : Беларус. Навука, 2011.

2. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007.

3. Схема анализа урока [Электронный ресурс]. URL: // https://nsportal.ru/nachalnaya-shkola/mezhdistsiplinarnoe obobshchenie/2021/03/19/shema-analiza-uroka-po-fgos (дата обращения: 14.03.2023).

4. *Поташник М. М., Левит М. В.* Как подготовить и провести открытый урок (современная технология). Методическое пособие. М. : Педагогическое общество России, 2003.

5. Праграма вучэбнай педагагічнай адаптацыйнай практыкі для спецыяльнасці: 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках); напрамку спецыяльнасці: 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), спецыялізацыі: 1-21 05 01-01 01 Мовазнаўства, 1-21 05 01-01 02 Літаратуразнаўства; 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя), спецыялізацыя: 1-21 05 01-03 03 Рыторыка. Рэг. № 11464/п. ад 10 студзеня 2023 г. [Электронны рэсурс]. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/293655 (дата звароту: 14.03.2023).

6. *Запрудский Н. И., Сухова Г. А.* Эффективные практики методической работы в школе. Минск : Сэр-Вит, 2022.